## Білет 22

**Практычнае заданне.**
**Гаспадарчае развіццё тэрыторыі Беларусі ў XIX-пачатку XX ст.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Якія галіны прамысловасці развіваліся ў Беларусі ў пачатку XX ст.?
2. Чаму ў пачатку XX ст. прамысловыя прадпрыемствы ствараліся пераважна ў сельскай мясцовасці?
3. Цытатамі з дакумента пацвердзіце ці абвергніце вывад: “19 лютага 1861 г. сяляне сталі свабоднымі ўласнікамі зямлі”.
4. Сфармулюйце 3 тэзісы для адказу на пытанне “Асаблівасці развіцця прамысловасці Беларусі ў другой палове XIX ст.”

**I. З Маніфеста аб адмене прыгоннага права** *(19 лютага 1861 г.)*

У сілу азначаных новых палажэнняў прыгонныя людзі атрымаюць у свой час поўныя правы свабодных сельскіх абывацеляў.

Памешчыкі, захоўваючы права ўласнасці на ўсе землі, якія належаць ім, прадастаўляюць сялянам, за ўстаноўленыя павіннасці, у пастаяннае карыстанне сядзібную іх аселасць і звыш таго, для забеспячэння побыту іх і выканання абавязкаў іх перад урадам, вызначаную ў палажэннях колькасць палявой зямлі і іншых угоддзяў.

Карыстаючыся сім пазямельным надзелам, сяляне абавязаны выконваць на карысць памешчыкаў вызначаныя ў палажэннях павіннасці. У гэтым стане, які ёсць пераходны, сяляне называюцца часоваабавязанымі.

Разам з тым ім даецца права выкупляць сядзібную іх аселасць, а са згоды памешчыкаў яны могуць набываць ва ўласнасць палявыя землі і іншыя ўгоддзі, адведзеныя ім у пастаяннае карыстанне. З набыццём ва ўласнасць пэўнай колькасці зямлі сяляне вызваляцца ад абавязкаў да памешчыкаў па выкупленай зямлі і ўступяць у рашучы стан вольных сялян-уласнікаў.

**II. Станаўленне фабрычнай вытворчасці** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка «Гісторыя Беларусі. Канец XVIII–пачатак XX ст. 8 клас»)*

Асаблівасцю развіцця прамысловасці Беларусі ў другой палове XIX ст. было суіснаванне як рамесных майстэрняў і мануфактур, так і фабрык, і заводаў. Колькасць фабрык і заводаў за 40 гадоў пасля рэформы 1861 г. вырасла ў 15 разоў. Калі ў 1860 г. фабрыкі і заводы давалі толькі каля дзясятай часткі ўсёй прамысловай прадукцыі заходніх губерняў, то ў канцы XIX ст. - амаль палову.

У Беларусі пераважалі дробныя і сярэднія фабрыкі і заводы з колькасцю працоўных да 50 чалавек. Буйных прадпрыемстваў, дзе працавала 500 і больш працоўных, было вельмі мала. У 1900 г. іх налічвалася ўсяго 9. Найбуйнейшым прадпрыемствам у Беларусі была тытунёвая фабрыка Шарашэўскага ў Гродне, заснаваная ў 1862 г. У 1900 г. на ёй лічылася 1445 працоўных. Сыравіну на фабрыку завозілі з поўдня Расіі і з-за мяжы. Прадукцыя прадавалася па ўсёй Расіі і ў Польшчы.

Другой асаблівасцю прамысловасці Беларусі было размяшчэнне прадпрыемстваў пераважна ў сельскай мясцовасці. У 1900 г. 2⁄3 фабрык і заводаў знаходзілася ў мястэчках і маёнтках, там жа жыло 45% працоўных. Размяшчэнне прадпрыемстваў паблізу ад крыніц сыравіны і таннай працоўнай сілы было выгадна капіталістам, паколькі давала магчымасць пры мінімальных выдатках атрымліваць вялікія прыбыткі. Але найбуйнейшыя фабрыкі і заводы размяшчаліся ў гарадах.

**ІІІ. Картасхема “Прамысловасць у 1913 годзе”**

